НАША ДАЧА — НАША КРЭПАСЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Участковыя інспектары разам са старшынямі праўленняў СТ абследуюць дачы, выяўляюць абставіны і ўмовы, якія ў далейшым спрыяюць правапарушэнням, і ўносяць адпаведныя прадстаўленні, дзе паказваецца, якія выяўлены недахопы і якім чынам яны павінны быць ліквідаваны. Старшыня праўлення абавязаны гэтыя недахопы разгледзець на агульным сходзе членаў СТ і прыняць меры, накіраваныя на ліквідацыю гэтых недахопаў.

— У мінулыя гады крадзяжы ў садовых таварыстваў складалі каля 15 % ад агульнай колькасці крадзяжоў, учыненых на тэрыторыі Мінскага раёна, — кажа Наталля Смятанка. — Агульнымі намаганнямі нам удалося гэты працэнт істотна знізіць. На базе райвыканкама праводзіліся сумесныя пасяджэнні, куды запрашаліся старшыні праўленняў СТ. На гэтых сходах таксама прысутнічалі прадстаўнікі Дэпартамента аховы МУС. Яны даводзілі інфармацыю пра свой спектр паслуг і раздавалі буклеты-памяткі, дзе паказана, якія існуюць магчымасці па прыняцці мер для аховы маёмасці.

Паводле звестак, за мінулыя 9 месяцаў на тэрыторыі раёна ў садовых таварыствах здзейснена 55 крадзяжоў. А, напрыклад, у 2015 годзе за той жа перыяд быў зарэгістраваны 91 крадзеж, у 2016 — 125, у 2017 годзе — 112 крадзяжоў. Такім чынам, дзякуючы сумесным намаганням удалося знізіць колькасць крадзяжоў больш чым на 50 %.

У чым складанасць раскрыцця «дачных» крадзяжоў? Людзі заканчваюць летні сезон, зачыняюць свае дамы на зіму і з'язджаюць. І да вясны, як правіла, не з'яўляюцца. А крадзяжы, якія здзяйсняюцца на іх участках у зімовы перыяд, выяўляюць толькі тады, калі гаспадары зноў прыязджаюць на дачы. Усплёск рэгістрацыі злачынстваў у садовых таварыствах — гэта, як правіла, сакавік-красавік. Хоць здзейснены яны былі восеннюзімой. Вядома, пасля таго, як мінуў час, раскрыць падобныя злачынствы нашмат складаней, чым «па гарачых слядах».

Ёсць больш буйныя садовыя таварыствы, дзе людзі застаюцца жыць на зіму і, такім чынам, існуе нейкі нагляд за пакінутымі дамамі. А ёсць невялікія пасёлкі, якія цалкам пусцеюць на зіму, і яны становяцца аб'ектам асаблівай цікавасці злачыннага элемента.

Прынята лічыць, што «дачныя» злачынцы — гэта большай часткай бамжы, якія крадуць толькі слоікі з закаткамі і іншую ежу. На самай справе, у першую чаргу выкрадаюцца каштоўныя рэчы. Напрыклад, «павышаным попытам», калі можна так сказаць, у зладзеяў карыстаюцца адзенне, посуд, розныя будаўнічыя інструменты (тут я ўспомніў свайго суседа, Уладзіміра Міхайлавіча), таксама, бытавая тэхніка: тэлевізары, халадзільнікі, іншыя прыборы. Яшчэ «цягнуць» з задавальненнем будматэрыялы. Напрыклад, з пакінутай будоўлі. Гаспадар усё лета ўзводзіў дом, не скончыў работы і з'ехаў у горад, пакінуўшы мяхі з цэментам, плітку, цэглу, той жа інструмент — усё гэта таксама служыць аб'ектам крадзяжу.

Прынята лічыць, што «дачныя» злачынцы — гэта большай часткай бамжы, якія крадуць толькі слоікі з закаткамі і іншую ежу. На самай справе, у першую чаргу выкрадаюцца каштоўныя рэчы.

У пацвярджэнне сказанага Наталля Вячаславаўна прывяла прыклады з апошняй крымінальнай зводкі:

«Неўстаноўленая асоба шляхам падбору ключоў да замка ўваходных дзвярэй пранікла ў дачны дом, размешчаны ў СТ «Алгарытм» паблізу вёскі Анусіна Мінскага раёна, адкуль таемна выкрала: тэлевізар «Панасонік», бензапілу «Штыль», электрарубанак «Бош», электрадрыль «Бош» і набор аўтамабільных ключоў «Форс», чым прычыняла заяўніку матэрыяльны ўрон на агульную суму 970 рублёў».

«Неўстаноўленая асоба шляхам зрыву навяснога замка і замыкальнай прылады ўваходных дзвярэй пранікла ў дом, размешчаны ў СТ «Сонечнае» паблізу вёскі Хадакова Мінскага раёна, адкуль выкрала зімовую куртку і перфаратар «ДВТ», чым прычыніла матэрыяльны ўрон пацярпеламу на агульную суму 130 рублёў».

«Неўстаноўленая асоба шляхам узлому аконнай рамы пранікла ў садовы домік у СТ «Раманаўка» паблізу вёскі Анусіна Мінскага раёна, адкуль таемна выкрала маёмасць, а менавіта: бензапілу «STIHL», дзве тэлевізійныя прыстаўкі, дзве тэлевізійныя антэны, чым прычыніла матэрыяльны ўрон пацярпеламу на агульную суму 400 рублёў».

Гэты спіс, на жаль, можна працягваць. Але навошта, калі і так усё зразумела.

Што ж трэба рабіць грамадзянам, каб засцерагчы пакінутыя на зіму хаты ад крадзяжу?

— Існуюць нескладаныя, але абавязковыя правілы, накіраваныя на абарону сваёй маёмасці ад злачынных замахаў, — кажа Наталля Вячаславаўна.

Безумоўна, найбольш эфектыўнай абаронай маёмасці з'яўляецца абсталяванне лецішчаў ахоўнай і трывожнай сігналізацыяй з падключэннем да цэнтральнага пульта пазаведамаснай аховы. Але калі няма такой магчымасці, можна зрабіць шэраг іншых крокаў.

У першую чаргу рэкамендуецца не пакідаць на дачы каштоўных рэчаў. Лепш за ўсё везці іх з сабой у горад, ці аддаваць на захоўванне добра знаёмым суседзям, якія пастаянна пражываюць у вашым населеным пункце.

Таксама варта максімальна ўскладніць доступ у жыллё стараннім. Трэба паставіць моцныя дзверы, абсталяваць іх складанымі замкамі, на вокны паставіць рашоткі.

Неабходна часцей наведваць сваё загараднае жыллё. Па нячышчаных дарожках зламыснікі зразумеюць, што гаспадары на дачы бываюць рэдка. Не зашкодзіць папрасіць суседзяў, якія пастаянна пражываюць у вёсцы, прыглядаць за вашым домам і адразу ж паведамляць вам пра здарэнні, якія адбыліся з вашай маёмасцю.

У выпадку страты ключа рэкамендуецца тэрмінова замяніць замкі. Калі ёсць магчымасць, трэба абсталяваць дом сродкамі відэафіксацыі.

А калі ўжо крадзеж адбыўся, трэба неадкладна паведаміць аб гэтым у міліцыю і да прыезду супрацоўнікаў аховы правапарадку пастарацца захаваць сляды злачынства.

Наша бяспека шмат у чым залежыць ад нашай пільнасці. Напрыклад, такая простая мера, як паведамленне ў міліцыю аб падазроных асобах альбо аўтамабілях паблізу вашага дома можа зберагчы вас у далейшым ад крадзяжу. Крыху больш ініцыятывы, уважлівасці — і ваш дом будзе вашай крэпасцю, якую не возьме ні адзін злачынец.

Трагедыя

Круты маршрут

На 74-м кіламетры трасы М6 Мінск—Гродна ў чацвер увечары адбылася страшная аварыя. На рэканструяемым участку дарогі ў месцы, дзе праезная частка змяняе напрамак руху, кіроўца маршрутнага таксі «Mersedes-Benz», 46-гадовы жыхар Гродна, не справіўся з кіраваннем і ўрэзаўся ў бетонную агароджу. У выніку ДТЗ двое пасажыраў загінулі. 66-гадовая жанчына памерла на месцы, 71-гадовы мужчына — у бальніцы.

Кіроўца і 13 пасажыраў, сярод якіх знаходзіліся 5-гадовая і 11-гадовая дзяўчынкі, атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці: пераломы, вывіхі, ірваныя раны, удары, чэрапна-мазгавыя, паведаміла прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія Барадун.

Яшчэ ўначы для аказання кансультацыйнай і практычнай дапамогі на месца выехалі ўрачы-хірургі з вобласці. Раніцай у Валожын прыбылі псіхолагі з Мінскага абласнога клінічнага цэнтра для аказання псіхалагічнай дапамогі пацярпелым.

«Адна пацярпелая пераведзена ў РНПЦ траўматалогіі і артапедыі ў сувязі з вельмі цяжкім станам. Ёй патрэбна будзе аперацыя. Тры чалавекі знаходзяцца ў Маладзечне — у іх стан таксама досыць цяжкі. Астатнія шпіталізаваны ў Валожынскую цэнтральную раённую бальніцу», — сказала Юлія Барадун.

Сітуацыя з аказаннем медыцынскай дапамогі знаходзіцца на асабістым кантролі міністра аховы здароўя.

Як паведамілі ва ўпраўленні Следчага камітэта па Мінскай вобласці, прычынай аварыі магло стаць перавышэнне хуткасці кіроўцам. Валожынскім раённым аддзелам Следчага камітэта ў дачыненні да кіроўцы ўзбуджаная крымінальная справа па ч. 3 арт. 317 КК (Парушэнне правілаў дарожнага руху, што пацягнула па неасцярожнасці смерць двух чалавек).

Следча-аператыўная група агледзела месца аварыі. Дапытваюцца сведкі і відавочцы, прызначаныя аўтатэхнічныя, судова-медыцынскія экспертызы, у тым ліку для вызначэння ступені цяжкасці траўмаў.

Кіроўца, які практычна не пацярпеў, затрыманы праваахоўнікамі.

Падрабязнасці

ПРЫМУСОВАЕ ВЯРТАННЕ НА РАДЗІМУ

Як паведамілі «Звяздзе» ў Следчым камітэце, Злучаныя Штаты Амерыкі дэпартавалі ў Беларусь абвінавачанага, які хаваўся за акіянам ад крымінальнага праследавання.

У Нацыянальным аэрапорце Мінск прадстаўнікі праваахоўных органаў ЗША перадалі прадстаўнікам Следчага камітэта Беларусі затрыманага 21-гадовага жыхара Гродна, які амаль два гады хаваўся ад крымінальнага праследавання. Такое рашэнне было прынята амерыканскім бокам на падставе мемарандума аб узаемаразуменні і аказанні прававой дапамогі па крымінальных справах, падпісанага 30 студзеня 2018 года намеснікам дырэктара ФБР Полам Эбейтам і старшынёй Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь Іванам Наскевічам у штаб-кватэры Федэральнага бюро расследаванняў ЗША ў Вашынгтоне.

Дэпартаваны гродзенец у чэрвені 2015 года быў асуджаны судом Кастрычніцкага раёна горада Гродна за незаконны абарот псіхатропных рэчываў (арт. 328 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь), але ў перыяд адбыцця пакарання на шлях выпраўлення не стаў і здзейсніў новыя злачынствы.

27 мая 2016 года ў Гродне ён набыў праз інтэрнэт асабліва небяспечнае псіхатропнае рэчыва, з якім на наступны дзень быў затрыманы супрацоўнікамі органаў унутраных спраў.

У перыяд расследавання падазраваны схаваўся ад крымінальнага праследавання, у сувязі з чым яму было завочна выстаўленае абвінавачанне ў здзяйсненні двух злачынстваў — незаконным абароце псіхатропных рэчываў і ўхіленні ад адбыцця пакарання ў выглядзе абмежавання волі. У якасці меры стрымання абрана заключэнне пад варту і вынесена пастанова аб аб'яўленні вышуку, у тым ліку міжнароднага па лініі Інтэрпола. Пры гэтым быў устаноўлены, затрыманы, выкрыты і пасля асуджаны судом грамадзянін, які збыў псіхатропнае рэчыва абвінавачанаму.

У жніўні 2017 года адшуканы грамадзянін Беларусі быў затрыманы праваахоўнымі органамі акругі Джэксан штата Фларыда ЗША за махлярства. Прымаючы пад увагу той факт, што яго дзеянні ў Рэспубліцы Беларусь па набыцці і захоўванні псіхатропных рэчываў прызнаюцца крымінальнымі на тэрыторыі ЗША, а таксама, у адпаведнасці з палажэннямі падпісанага мемарандума, амерыканскі бок прыняў рашэнне аб выдварэнні абвінавачанага і перадачы беларускаму боку.

Зараз вядзенне па крымінальнай справе адноўлена. Пасля неабходных следчых дзеянняў абвінавачаны будзе ўтрымлівацца ў следчым ізалятары.

Следчы камітэт Рэспублікі Беларусь выказвае ўдзячнасць Федэральнаму бюро расследаванняў ЗША, Нацыянальнаму цэнтральнаму бюро Інтэрпола ў ЗША і Рэспубліцы Беларусь, пасольству ЗША ў Рэспубліцы Беларусь за паслядоўную рэалізацыю мемарандума і дасягнутых дамоўленасцяў, садзейнічанне ў рэалізацыі прынцыпу непазбежнасці пакарання за здзейсненыя злачынствы. Пры гэтым выказвае гатоўнасць ажыццявіць сустрэчныя дзеянні са свайго боку.

Матэрыялы падрыхтаваў Сяргей КУЛАКОЎ.